# § 21. Даданыя члены сказа. Дапаўненне

**Успамінаем і паўтараем**

**154.** Прачытайце тэкст. Пра які край расказваецца ў ім?

### Азёрны край

Гэта край сініх азёр. Ведаеш, колькі тут вялікіх і малых азёр!



***Некалі в..лізáрны л..днік зм..ніў прыроду гэтага дзівоснага краю.*** Даўным-даўно л..днік пакінуў яму на памяць мноства в..лікіх і малых азёр. Брасла..скія азёры зрабілі гэты край цудо..ным месцам нашай планеты. Шануй гэту пр..гажосць! *(Паводле Т. Дамаронак).*

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. У выдзеленым сказе падкрэсліце галоўныя члены сказа. Як называюцца іншыя члены сказа?

Разгледзьце фотаздымак. Чаму нашу краіну называюць сінявокай? Ці ілюструе фотаздымак змест тэксту?

!

Члены сказа, якія паясняюць дзейнік і выказнік і залежаць ад іх, называюцца **даданымі членамі сказа:** ***Пад ракітавым кустом*** *заяц* *збудаваў* ***свой дом*** (М. Танк).

Да даданых членаў сказа адносяцца дапаўненне, азначэнне і акалічнасць.



Правообладатель Академия образования

**155.** Прачытайце табліцу. Вусна дапоўніце яе склонавымі пытаннямі і прыкладамі форм назоўнікаў ва ўскосных склонах.

| Склон | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| Н. | х т о? ш т о? | *чалавек, зямля* |
| Р. | к а г о? ________? | *чалавека,* ________ |
| Д. | к а м у? ч а м у? | ________, ________ |
| В. | ________? ________? | *чалавека,* ________ |
| Т. | к і м? ______? | ________, *зямлёй (зямлёю)* |
| М. | п р ы к і м? н а ________? | *пры* ________, *на зямлі* |

Ці могуць дадзеныя члены сказа ўжывацца ў форме назоўнага склону?

Складзіце сказы з дадзенымі членамі сказа (назоўнікамі ў форме меснага склону).

! Усе склоны, акрамя назоўнага, называюцца **ўскоснымі.**

**156.** Прачытайце. Якой вы ўяўляеце дзяўчынку?

Вызначце ў сказах першага слупка граматычныя асновы. Ад галоўных членаў сказа пастаўце пытанні ўскосных склонаў да іншых членаў сказа. Што гэтыя словы абазначаюць? Якімі часцінамі мовы яны з'яўляюцца?

## Натка

Добра вучыцца дзяўчынка,
памагае дома шчыра
маме і сябрам таксама.
Натку вельмі любіць мама.

Хто яна?
Мо чараўніца?
Не,
дзяўчынка-працаўніца.

*І. Стадольнік.*

×

Запішыце словазлучэнні «дзеяслоў + назоўнік».

Падбярыце аднакаранёвыя словы да назоўніка *працаўніца*.

! **Дапаўненне** — гэта даданы член сказа, які абазначае прадмет і адказвае на пытанні ўскосных склонаў: *памагае* (к а м у?) ***маме***, *чытае* (ш т о?) ***кнігу***, *сябруе* (з к і м?) ***з аднакласнікамі.***

У сказе дапаўненне выражаецца назоўнікам ці займеннікам і залежыць ад выказніка:

ш т о?
к а м у?

*Сваю* ***пяшчоту*** ***маме*** *я* *прыношу* (М. Шабовіч).

ш т о?
к а м у?
ч ы м?

***Свята*** ***мне*** *прыносіш* *ты* ***ўсмешкай*** *маладой* (В. Жуковіч).

Пры разборы сказа дапаўненне падкрэсліваецца пункцірнай лініяй.

**157.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай. Якое свята матуль адзначаецца восенню? Выпішыце са сказаў выказнікі разам з дапаўненнямі. Складзіце схемы словазлучэнняў.

к а г о?

У з о р: *любіць дзяцей.*

Ніхто цябе так не шкадуе і не любіць, як мама.

Ніхто так горка не тужыць па табе.

Мама радуецца нават самым маленькім радасцям сваіх дзяцей. *Матуля — падтрымка ў горы і радасці.*

Таму беражыце, шануйце і любіце сваіх матуль. І прыносьце ім толькі радасць і кветкі *(Паводле С. Грахоўскага).*

Растлумачце сэнс выдзеленага сказа.

**158.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словазлучэнні, якія адпавядаюць схеме. Выкарыстайце іх у дыялогу.

к а м у?

дзеясл. + наз.



Правообладатель Академия образования

Па-беларуску трэба дзякаваць не каго, а каму — *дзякую вам*; прабачаць не каго, а каму — *прабачце мне*. І пасміхацца не над кім, а з каго. І не адкрыць кнігу, а *адгарнуць, разгарнуць (Паводле Я. Скрыгана).*

Растлумачце напісанне прыставак у словах *адкрыць, адгарнуць, разгарнуць*.

**159.** Прачытайце, пашыраючы сказы дапаўненнямі.

### Сны

Птушкаферма сніцца (к а м у?) ...,
Сніцца (к а м у?) ... мёду міса.
Сніцца (к а м у?) ... капуста,
Сніць цялятка хлеба (ш т о?) ... .
А (к а м у?) ... Ігнатку
Сніцца ў дзённіку дзясятка.

*А. Пісьмянкоў.*

Д л я  д а в е д к і: *мішка, зайчык, ліс, свавольнік, луста.*

Да слоў *свавольнік* і *луста* падбярыце сінонімы.

Запішыце тэкст. Падкрэсліце дапаўненні, вызначце, якой часцінай мовы яны выражаны.

**160.** Прачытайце скорагаворкі. Вызначце, якое з выдзеленых слоў з'яўляецца дзейнікам, а якое — дапаўненнем.

*дырыжо́р*

**Ліна** ела **мандарыны,**
Ян іграў на мандаліне.

*А. Клышка.*

Апранае **грак**
Чорны-чорны **фрак.**
Будзе дырыжорам
У сарочым хоры.

*Н. Галіноўская.*

**Паўка** пакаваў **пакупкі**
Пакупнікам у пакункі*.
*М. Пазнякоў.*

Выпішыце дапаўненні разам са словамі, ад якіх яны залежаць. Складзіце схемы словазлучэнняў.

## § 22. Азначэнне

**161.** Прачытайце верш П. Панчанкі «Бацькаўшчына». Што такое для вас Бацькаўшчына?

Што такое Бацькаўшчына, знаеш?
Гэта рэчка, **сцежачка** лясная,
гэта ў лузе залатая **пчолка**,
а ў **вачах** тваіх — вясёлка.
Бацькаўшчына — гэта **дом** твой, школа,
гэта песні, што звіняць наўкола,
Гэта сам ты, гэта **тата** твой і мама
і **сябры** твае таксама.

Пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да дадзеных членаў сказа. Запішыце словазлучэнні, якія ў вас атрымаліся. У якім значэнні — прамым ці пераносным — ужыта слова *залатая*?

!

**Азначэнне** — гэта даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я? ч ы й? ч ы я? ч ы ё? ч ы е?

Азначэнне звычайна выражаецца прыметнікам ці займеннікам. Залежыць яно ад членаў сказа, выражаных назоўнікам:

ч ы й?

*І над вёскай далёка чуецца **бусліны** клёкат* (Г. Аўласенка).



Правообладатель Академия образования

ч ы і х? я к о е?

*А ў вачах **яе**, здаецца, неба **сіняе** смяецца* (У. Мазго).

У сказе азначэнне падкрэсліваецца хва́лістай лініяй.

**162.** Прачытайце тэкст, замяняючы пытанні словамі. Вызначце тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

## Сож

(Я к і?) Сож пачынаецца ў Расіі, н..далёка ад гор..да См..ленска. Але мы лічым яго (ч ы ё й?) р..кой. Таму што (я к а я?) (ч ы я?) частка працякае па тэрыторыі Бел..русі.

Сож лічыцца прытокам Дняпра. Аднак ён мае (ч ы е?) прытокі. А яшчэ Сож з'яўляецца адной з (я к і х?) рэк у Еўропе. Мы клапоцімся пра (ч ы ю?) чысціню *(Паводле Г. Аўласенкі)*.

Д л я д а в е д к і: *свой, прыгожы, яго, асноўны, наш, яе, найчысцейшы.*

Прытокам якой ракі з'яўляецца Сож? Які абласны цэнтр размясціўся на рацэ Сож? Што вы ведаеце пра гэты горад?

Запішыце першы абзац тэксту, замяняючы пытанні словамі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

Падкрэсліце ў сказах дзейнікі і выказнікі. Вызначце, якім членам сказа з'яўляюцца ўстаўленыя ў тэкст словы.

**163.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Якія прыметы прадметаў падказалі вам адгадку?

Садовыя, мядовыя,
сакаўн.., наліўн.. .
*А. Клышка.*



У бочачцы чырвон..
Рубінаў* поўным-поўна.
*М. Пазнякоў.*



На працягу года
Снежн.. асалода*.
*А. Клышка.*



Спішыце загадкі, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце азначэнні.

Са словамі-адгадкамі складзіце словазлучэнні па схеме:

я к і? (я к о е? я к і я?)

прым. + наз.

**164.** Прачытайце тэкст, пашыраючы яго прыметнікамі. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай. Што дапамагае хлопчыку вызначыць пару года?

Я напісаў сачыненне пра сваю любімую рабіну.

«Мая ... рабінка расце каля нашага балкона. Яе адзенне падказвае мне пару года.

У красавіку ... пупышкі ператвараюцца ў лісце. У маі на дрэве з'яўляюцца ... суквецці*.

Летам я ўбачу на рабінцы ... гронкі ягад.

*У кастрычніку рабіна шапаціць пад ветрам ... лістотай. А ... гронкі гараць на сонцы. У лістападзе з рабінкі ападаюць усе лісцікі. Толькі ўрачыста ззяюць ... ягады.*

Зімой ... ягады дзяўбуць вераб'і і ... сініцы. А мая рабіна заснула да вясны».

Вось і напісаў я сачыненне. Настаўніца пачытае. І ёй абавязкова спадабаецца мая рабінка *(Паводле Т. Мушынскай).*

Запішыце выдзелены абзац тэксту разам з прыметнікамі. Падкрэсліце ў сказах дзейнікі, выказнікі і азначэнні.



Правообладатель Академия образования

**165.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Чаму так называецца музей? У які музей вы запрасілі б сваіх сяброў?

## Музей белки

Музей белки размещается в городском посёлке Большая Берестовица. Белочка с огромной радостью встречает новых



посетителей. Половина экспонатов посвящена этой рыжей непоседе. Здесь находятся и мягкие игрушки, и интересные книги, и вкусные конфеты «Белочка». А ещё старинные открытки, ёлочные украшения, разные предметы быта *(По Л. Минкевич)*.

**Слоўнік**

быт — *побыт*
ёлочные украшения — *ёлачныя ўпрыгожанні*
непоседа — *гарэза*
открытка — *паштоўка*
посвящён — *прысвечаны*
посетитель — *наведвальнік*
старинный — *старадаўні*

Запішыце тэкст па-беларуску. Падкрэсліце азначэнні. Ад якіх слоў яны залежаць? Абгрунтуйце сваю думку.

Ці пададзена ў тэксце апісанне вавёркі? Вусна апішыце звярка, карыстаючыся малюнкам і словамі для даведкі.

Для даведкі: *рыжы, пушысты, запаслівы, чорны, маленькі, жвавы, беленькі, спрытны.*

## § 23. Акалічнасць

**166.** Прачытайце ўрывак з тэксту «Хто як зімуе». Выправіце наўмысна зробленыя аўтарам памылкі ў падачы звестак пра жывёл.

**Моцна** *спіць* **зімой** вавёрка — у яе пад снегам норка. А ў **бярлозе, у бары,** *смокча* лапу лось стары. І казуля не ўтрывала

і таксама *прыдрамала* **ў нары, у гушчары**, да вясновае пары… *(Г. Аўласенка)*.

Ад падкрэсленых выказнікаў пастаўце пытанні да выдзеленых слоў. Да якіх слоў можна паставіць два пытанні?

З першага і другога сказаў выпішыце словазлучэнні з галоўным словам дзеясловам.

> **!**
>
> **Акалічнасць** — гэта даданы член сказа, які абазначае месца, час, прычыну, спосаб дзеяння. Акалічнасць месца адказвае на пытанні дзе? куды? адкуль?; акалічнасць часу — на пытанні калі? у які прамежак часу?; акалічнасць прычыны — на пытанні чаму? па якой прычыне?; акалічнасць спосабу дзеяння — на пытанні як? якім чынам?
>
> У сказе акалічнасць залежыць ад выказніка і выражаецца назоўнікам з прыназоўнікам, а таксама словамі, якія абазначаюць месца *(блізка, далёка)*, час *(заўсёды, учора)*, якасць *(весела, лёгка)* і інш.:
>
> куды?
>
> *Я сонца клічу* ***ў падарожжа*** (Р. Барадулін).
>
> як?
>
> ***Дрыготка*** *шапоча лістота* (У. Мазго).
>
> Пры разборы сказа акалічнасць падкрэсліваецца штрыхпунктырам (штрых і кропка).

**167.** Прачытайце скорагаворкі М. Пазнякова. Назавіце словы, якія гучаць аднолькава, але маюць рознае значэнне. З якой мэтай аўтар выкарыстоўвае іх у сказах?

1) Не шукайце Пашу —
Статак разам з татам
Ён пагна.. на пашу.

2) Для с..стрычкі Полі
Васількоў буке..ік
Я нарваў у полі.



Правообладатель Академия образования

Ад дзеясловаў пастаўце пытанні да назоўнікаў з прыназоўнікамі. Вызначце, якім членам сказа яны з'яўляюцца.

Запішыце скорагаворкі, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце ў сказах граматычныя асновы і акалічнасці.

Прывядзіце прыклады назоўнікаў, якія могуць быць напісаны з вялікай і з малой літары.

**!**

Да акалічнасцей, выражаных назоўнікам з прыназоўнікам, можна паставіць два пытанні — пытанне ўскоснага склону і сэнсавае пытанне:

н а ч ы м? д з е?

к а л я ч а г о? д з е?

***На гасцінцы каля лодак*** *прымасціўся* *зімародак* (Л. Воранава).

Пытанне ўскоснага склону дапамагае вызначыць, у форме якога склону ўжыты назоўнік: *прымасціўся* (н а ч ы м?) ***на гасцінцы*** — *назоўнік у форме меснага склону*, а сэнсавае — якім членам сказа гэты назоўнік з'яўляецца: *прымасціўся* (д з е?) ***на гасцінцы*** — назоўнік з прыназоўнікам з'яўляецца акалічнасцю.

**168.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай. Назавіце апорныя словы.

***якра́з***



Людзі назвалі гэтыя ягады журавінамі нездарма. Яны паспяваюць восенню. Якраз у гэты час на поўдзень адлятаюць жураўлі. Перад дарогай птушкі ласуюцца спелымі ягадамі.

Збор журавін дазваляецца з сярэдзіны верасня. Але частка іх «зімуе»

на балотах. Зімой ягады перамярзаюць. Вясной жураўлі з задавальненнем дзяўбуць салодкія журавіны *(Паводле Х. Гурыновіча)*.

Чаму ягады назвалі журавінамі?

Калі ў Беларусі дазваляецца збіраць журавіны? Як вы думаеце чаму?

Пастаўце пытанні ўскосных склонаў і сэнсавыя пытанні да акалічнасцей. У якім выпадку зрабіць гэта немагчыма?

Запішыце апошні сказ. Вызначце, што абазначаюць акалічнасці (месца, час, спосаб дзеяння).

Раскажыце пра карысныя якасці журавін.

## *Гавары і пішы правільна*

Калі збіраюцца ў лес, на балота ці ў іншае месца, каб назбіраць грыбоў, ягад, арэхаў, то па-беларуску звычайна гавораць: ***пайсці ў суніцы, у журавіны, у грыбы, у арэхі.***

**169.** Прачытайце. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго пісьмова.

к а л і? к у д ы?

1) … бацька з сынам пайшлі … .

д з е? я к? я к і я? ч а г о?

2) … яны … назбіралі … кошыкі … .

я к і я? я к? к у д ы?

3) … грыбнікі … вярталіся … .

Як трэба правільна збіраць грыбы?



Правообладатель Академия образования

**170.** Прачытайце тэкст. Чаму ён так называецца?

## Мы ганарымся

На фабрыках і заводах нашай краіны выдатна працуюць людзі розных прафесій. Яны штодзень праслаўляюць Беларусь сваёй працай. Прадукцыя нашых прадпрыемстваў высока цэніцца за межамі Беларусі.

Ва ўсім свеце добра веда..ць наш тракт..р «Бел..рус». Завод па вытворчасці гэт..х трактароў знаходз..цца ў Мінску. *Б..ларускія трактары да..но з'яўляюцца наш..м гонарам.* Яны р..гулярна пастаўля..цца ў розныя краіны свету *(Паводле Д. Дубінінай)*.

Чым яшчэ могуць ганарыцца беларусы?

Якое слова мае значэнне 'выраб якой-небудзь прадукцыі'?

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа ў выдзеленым сказе. Складзіце яго схему.

**171.** «Збярыце» са слоў сказы, каб яны адпавядалі схемам.

1) вочы, радасна, бабуліны, усміхаліся;




2) ноч, небе, запаліла, на, зоркі;




3) прыляцела, з, выраю, далёкага, ластаўка.




Вызначце склон ужытых у сказах назоўнікаў.

Да слова *ноч* падбярыце аднакаранёвыя словы розных часцін мовы.